**САУЧАНКА Я.А.** Індывідуальна арыентаваная адукацыя: Праект сучаснага філасофскага абгрунтавання. - С.20-34.

**БОЛБАС В.С.** Маральны ідэал этнічнай педагогікі беларусаў. - С.148-153.

ЗНАК ПОЧЕТА

# Народная Асвета

6/1999

* * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * *



*Валерый Сяргеевіч Болбас родам з Гомельшчыны. Пасля заканчэння Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, атрымаўшы дыплом настаўніка матэматыкі, дваццаць пяць гадоў аддаў працы ў школах г. п. Акцябрскі. І менавіта праца ў школе стала тым падмуркам, на якім вырасла цікавасць да навукі педагогікі. Захапленне гэтай навукай вылілася ў глыбокае яе вывучэнне і прывяло да абароны кандыдацкай дысертацыі. З 1995 г. Валерый Сяргеевіч — дацэнт, затым загадчык кафедры педагогікі, а з 1999 г. — прарэктар па навуковай рабоце Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута.*

*Аўтар 64 навуковых прац па гісторыі педагогікі Беларусі. Сярод іх — манаграфія «Ідэі маральнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння (XVI—XVII стст.)», навучальны дапаможнік «Народная педагогіка беларусаў» (у сааўтарстве), публікацыі ў педагагічных выданнях і інш.*

*Асаблівую цікавасць праяўляе да народнай педагогікі беларусаў, бо, на яго думку, менавіта там адказы на пытанні духоўнага, і не толькі духоўнага, аздараўлення грамадства. Выверaная жыццём і часам народна-педагагічная мудрасць заслугоўвае большай увагі сучасных навукоўцаў і практычных арганізатараў навучальна-выхаваўчага працэсу.*

# МАРАЛЬНЫ ІДЭАЛ ЭТНІЧНАЙ ПЕДАГОГІКІ БЕЛАРУСАЎ

Звяртаючыся да скарбніцы народна-педагагічнага вопыту, у першую чаргу хацелася б устанавіць, якія мэты ставіліся перад традыцыйным выхаваннем падрастаючых пакаленняў, якія прыярытэты вызначалі сутнасць і змест народнага выхавання, якой была скіраванасць народна-выхаваўчай сістэмы. Гэтым праблемам прысвяцілі свае даследаванні многія гісторыкі педагогікі. Вельмі складана даць адназначныя адказы на пастаўленыя пытанні. Адны навукоўцы лічаць, што стрыжнем народнага выхавання з'яўляецца працоўнае выхаванне, другія — разумовае, трэція — маральнае, чацвёртыя бачаць яго ў гарманічным выхаванні асобы. Адпаведна гэтаму вызначаюцца мэты выхавання і вылучаецца выхаваўчы ідэал.



Сучасныя беларускія вучоныя Г. М. Арлова, К. А. Кулінковіч, Я. І. Сярмяжка і іншыя першаасновай этнапедагогікі беларусаў лічаць культ працы. І сапраўды, гісторыка-педагагічны аналіз пацвярджае, што выхаванню працалюбства нашы продкі надавалі першарадную ўвагу. Але мусім заўважыць, што ў грамадскай думцы яно ўхвалялася толькі тады, калі было напоўнена адпаведным маральным сэнсам. Працоўныя намаганні, руплівасць дзеля ўласнай выгады, наадварот, рашуча асуджаліся. Гэтак жа розум і фізічная сіла набывалі грамадска значную каштоўнасць толькі пры ўмове выкарыстання іх у інтарэсах людской супольнасці і барацьбе са злом. Калі ж яны выходзілі за маральныя межы, то ўяўлялі сур'ёзную небяспеку. Таму слушнымі ўяўляюцца высновы, да якіх прыходзіць В. А. Салееў [1. С. 68] і з якімі пагаджаецца В. У. Чэчат [2. С. 62], што ядром народнай педагогікі беларусаў з'яўляецца паняцце дабра. Народнае разуменне агульнага дабра стварала падмурак гармоніі маральнай прыроды чалавека са светам.

Так, можна з упэўненасцю канстатаваць, што этыка-маральнае напаўненне паняцця дасканалага чалавека ў этнічнай педагогіцы беларусаў з'яўляецца найважнейшым. А маральна-выхаваўчыя мэты ў сваю чаргу вызначалі галоўную педагагічную традыцыю народна-выхаваўчай сістэмы. І таму ў гэтай сістэме фарміраванне дабрадзейнай асобы займае адно з самых пачэсных месц.

З іншага боку, як вядома, любая педагагічная дзейнасць прадугледжвае абавязковую наяўнасць адпаведных ідэалаў. Без ідэалаў выхавання педагагічная практыка трациць усялякі выхаваўчы сэнс. Наогул, вызначэнне мэты выхавання асобы з'яўляецца галоўным звяном кожнай педагагічнай сістэмы. Спецыфічнасць народна-выхаваўчай дзейнасці заключаецца ў тым, што яна не адасабляецца ў спецыяльна арганізаваны працэс і што многія палажэнні народнай педагогікі ў несфармуляваным выглядзе ўтрымліваюцца ў розных элементах духоўнай культуры.

Маральны ідэал народнай педагогікі ў першую чаргу абумоўлівае яе выхаваўчыя мэты, і практычна ў ім гэтыя мэты своеасабліва раскрываюцца. Маральны ідэал выражае народныя патрабаванні да асобы, якія рэгулююць адносіны паміж асобай і грамадствам, а таму з'яўляецца каштоўнасным арыенцірам удасканалення жыцця кожнага асобнага чалавека і грамадства наогул. У ім адлюстроўваюцца грамадскія каштоўнасці, якія фіксуюць духоўны лад жыцця, менталітэт народа. Таму выхаваўчыя мэты другарадныя ў адносінах да маральнага ідэалу. У адрозненне ад мэты, якая носіць практычны характар і ўяўляе больш-менш канкрэтны вынік педагагічнага працэсу, ідэал хутчэй указвае стратэгічны напрамак на мэту, чым канкрэтызуе яе. Нягледзячы на тое, што ідэалы звычайна не рэалізуюцца поўнасцю ў жыцці, яны знаходзяцца ў арганічным адзінстве з рэчаіснасцю і арыентуюць на стварэнне вышэйшай формы грамадскай арганізацыі людзей, вышэйшай ступені маральнага развіцця. Яны як бы ўяўляюць жаданую будучыню, якая абапіраецца на існуючую рэчаіснасць. І чым больш выхаваўчыя мэты адпавядаюць сістэме грамадскіх каштоўнасцей, якая склалася, тым больш эфектыўнымі будуць педагагічныя намаганні грамадства.

Маральны ідэал у народнай педагогіцы адначасова выконвае некалькі функцый. Ён у пэўнай ступені непасрэдна з'яўляецца мэтай выхавання; як узор для пераймання ідэал выконвае ролю выхаваўчага сродку; часта выступае ў якасці матыву самаўдасканалення, рэгулятара паводзін і крыніцы актыўнасці асобы.

У этнічным маральным ідэале адлюстроўваюцца менталітэт і нацыянальная псіхалогія народа. Апошнія ў сваю чаргу ў многім залежаць ад пераважных тыпаў тэмпераменту, якія фарміруюцца пад уплывам пэўных умоў быцця і адпаведнага выхавання. Важную ролю пры гэтым выконваюць прыродна-геаграфічныя і генетычныя фактары, асаблівасці гістарычнага, сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця народа. Грамадскія каштоўнасці непасрэдна ўплываюць на вызначэнне выхаваўчых мэт. Са зменай каштоўнасцей мяняюцца і мэты выхавання. З іншага боку, маральна-выхаваўчыя мэты самі ўплываюць на фарміраванне нацыянальнага характару, менталітэту народа. Дзякуючы трансляцыі з пакалення ў пакаленне найбольш стабільных маральна-духоўных каштоўнасцей і ментальных якасцей адпаведнага соцыуму, а таксама ўзбагачэнню іх агульначалавечымі каштоўнасцямі цывілізацый, маральны ідэал выконвае важную менталеўтваральную функцыю і садзейнічае не толькі захаванню, але і карэкцыі і пераўтварэнню каштоўнасных жыццёвых арыенціраў. Таму, нягледзячы на значную ўстойлівасць менталітэту, яны з цягам часу могуць паступова мяняцца, набываць новыя рысы і якасці. Наогул, як сцвярджаюць этнапсіхолагі Б. А. Вяткін і В. Ю. Хацінец, «из всей совокупности психологических особенностей, характеризующих этнос, наибольшей статичностью обладает психический склад, включающий национальный характер, национальный темперамент, специфические особенности направленности личности (моральные убеждения, ценностные ориентации, взгляды, идеалы и т. п.)...» [3. С. 71].

Гэтак жа і маральны ідэал не можа быць нязменным, раз і назаўсёды зададзеным. Змены яго зместу адбываюцца як па вертыкалі (у залежнасці ад часу паступова мяняюцца агульначалавечыя маральныя каштоўнасці), так і па гарызанталі (у пэўны час кожны этнас мае свае адметныя каштоўнасныя арыентацыі). Але, нягледзячы на такое непастаянства маралі ў часе і прасторы, агульначалавечы маральны ідэал захоўвае шэраг духоўных каштоўнасцей, якія непадуладны ні гістарычным, ні класавым, ні нацыянальным перыпетыям, і таму ён забяспечвае пераемнасць у развіцці тэорыі і практыкі маральнага выхавання. Даследчыкамі адзначаецца, што традыцыйныя маральна-духоўныя катэгорыі — дабро, зло, абавязак, шчасце, сумленне, сорам — ва ўсе часы стваралі падмурак арганізацыі супольнага жыцця. Маральны ідэал многіх народаў таксама ўтрымлівае шэраг аднолькавых агульначалавечых рыс, такіх, напрыклад, як працалюбства, павага да старэйшых, пачуццё ўласнай годнасці, гасціннасць і іншыя, але праяўляюцца яны ў розных народаў своеасабліва — як па афарбоўцы, каларыту, так і па сіле, інтэнсіўнасці ў залежнасці ад уласнай этна-нацыянальнай іерархіі адпаведных духоўна-культурных каштоўнасцей. Без апоры на гэтыя асаблівасці немагчыма эфектыўнасць выхаваўчага працэсу. Не выпадкова В. В. Розанаў папярэджваў: «Создание человека вне духа своей культуры, синтетически собранного из элементов всех цивилизаций, есть идея крайне искусственная» [4. С. 23].

Вось чаму і для тэарэтычнай распрацоўкі пытанняў маральнага выхавання, і для практычнай арганізацыі гэтага працэсу вельмі важна ўлічваць народны вопыт у вызначэнні асноўных арыенціраў маральна-духоўнага фарміравання асобы, якія і акрэсліваюць «контур» ідэалу дасканалага чалавека. П. Ф. Капцераў папярэджваў, што ў выхаванні вельмі важна арыентавацца на агульначалавечыя каштоўнасці, якія ляжаць у аснове кожнага нацыянальнага ідэалу, аднак эфектыўнасць вырашэння выхаваўчых задач залежыць ад апоры на этна-культурныя адметнасці грамадства,



бо «одного общечеловеческого, всенародного педагогического идеала не существует» [5. С. 190].

Асаблівую актуальнасць для нашай краіны набываюць гэтыя пытанні ў апошні час, калі назіраецца механічны перанос на сучасную рэчаіснасць заходнееўрапейскіх і амерыканскіх ідэалаў. Тым самым падрываюцца асновы ўласнай маральна-духоўнай скіраванасці традыцыйнага выхавання з іх гуманістычным зместам. Падобнае не раз назіралася ў гісторыі развіцця беларускага народа, але, як адзначаюць даследчыкі, тыповыя беларусы без перашкод «дапускаюць» ва ўнутраныя этна-культурныя працэсы толькі такія элементы і з'явы, якія адпавядаюць нацыянальнаму характару і духоўным перакананням народа. Таму і сучасныя спробы скіраванасці да еўрапейскай адукаванасці з яе выключнай рацыяналістычнасцю без напаўнення традыцыйнай духоўнасцю ўяўляюцца бесперспектыўнымі.

Асаблівасць маральнага ідэалу народнай педагогікі беларусаў, яго адметнасць сярод адпаведных ідэалаў народаў-суседзяў вызначаюцца ў першую чаргу гістарычным шляхам, які прайшоў наш народ. Цяпер навукай устаноўлена, што беларуская народнасць належыць да ўсходніх славян, але сфарміравалася яна на балцкім субстраце (падаснове). Такі балта-славянскі сінтэз, які з'яўляўся вызначальным элементам у этнагенезе беларусаў, апрача ўсяго іншага, садзейнічаў развіццю пэўных адметнасцей у духоўнай культуры нашага народа і яго менталітэце. Навукоўцамі называецца, шэраг псіхалагічных рыс, напрыклад, стрыманасць, што сфарміраваліся пад уплывам балтаў. У той жа час сучасныя даследчыкі айчыннай гісторыі папярэджваюць, што перабольшваць уплыў неўсходнеславянскага насельніцтва на беларускую культуру не трэба. М. Ф. Піліпенка перакануча паказвае, што «аснову беларускага народа складалі ўсходнеславянскія групы — старажытныя палешукі і старажытныя беларусцы» [6. С. 34]. Таму ў змястоўным напаўненні структуры маральнага ідэалу славян значна больш агульнага, чым адрозненняў.

І ў далейшым гістарычным развіцці нацыянальны склад насельніцтва Беларусі быў неаднародным. Разам з беларусамі тут пражывалі рускія, палякі, украінцы, яўрэі, літоўцы, татары і іншыя, што накладвала пэўны адбітак на фарміраванне культуры нашага народа. Хаця падобнае становішча было і ў іншых краінах Еўропы, але, як падкрэсліваюць сучасныя навукоўцы, у адрозненне ад іх у Беларусі розныя нацыянальныя групы к XVIII ст. мелі рознае сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча. Таму не зусім адэкватна яны ўплывалі на нацыянальныя духоўна-культурныя працэсы.

Істотны ўплыў на фарміраванне маральнага ідэалу беларусаў аказала хрысціянства. Асаблівасцю яго распаўсюджання на землях продкаў была адносная негвалтоўнасць і паступовасць, што прывяло да адначасовага існавання ў сярэдняевечны язычніцтва і хрысціянства і дазволіла ў далейшым захаваць элементы язычніцкай веры. Пэўныя адметнасці духоўнай культуры беларусаў склаліся ў далейшым у сувязі з развіццём шматканфесійнасці. Геапалітычнае становішча беларускіх зямель на перакрыжаванні шляхоў паміж Захадам і Усходам, Поўначчу і Поўднем садзейнічала пранікненню сюды шматлікіх іншаземных культурных элементаў.

Як і ў іншых народаў, у першааснове ўяўленняў беларусаў аб маральным ідэале знаходзіліся прыродная цяга да дабра, унутраныя памкненні чалавека да свабоды, схільнасць да прыгожага, жаданне спасцігнуць ісціну. Асаблівасць прыродна-кліматычных умоў, абшчыннае землеўладанне,

адсутнасць рабаўладальніцтва і іншыя гісторыка-генетычныя і культураўтваральныя фактары спрыялі вылучэнню беларусамі ў якасці вызначальных рыс дасканалага чалавека такіх, якія скіроўвалі яго да абшчыннасці, супольнасці, фарміравалі спакойны, разважлівы характара. Само паняцце дабра мела на ўвазе карысць для іншых, для грамадства. Схільнасць беларускага народа да калектывізму дасягнула найбольш высокага ўзроўню ў эпоху сярэднявечча. Шырокае распаўсюджанне набыла тады суседская абшчына. Жыхары аднаго ці некалькіх пасяленняў аб'ядноўваліся ў так званую грамаду, сумесна валодалі зямлёй, мелі ўласныя органы самакіравання. Адпаведную арыентацыю да агульнага дабра замацоўвалі такія старадаўнія народныя звычаі, як талака, сябрына, бонда і інш. Падобная адметнасць рыс і якасцей уласціва наогул усходнім славянам. Згадаем, што яшчэ ў Лаўрэнцьеўскім летапісу 1176 г. апавядаецца, што кіяўляне, смаляне і палачане «на вече, как на думу сходятся».

Адзначаная асаблівасць маральнага ідэалу беларусаў узмацнялася асноўнымі пастулатамі хрысціянскай этыкі і займала адно з цэнтральных месц у мэтах і змесце народнага выхавання. Даследчыкі аднадушныя ў тым, што маральныя ўяўленні візантыйцаў і славян выявілі дзівосную сумяшчальнасць. Сацыяльная арыентацыя маральных якасцей дасканалага чалавека, прапануемага хрысціянскай этыкай, таксама падкрэслівалася ў кожным жанры вуснай народнай творчасці. У адной са старых казак, што запісана А. К. Сержпутоўскім, выйсце з цяжкага становішча людзей падаецца такім чынам: «І пачаў Асілак навучаць, каб людзі жылі ў згодзе да ў ласцэ. Тады, кажа, ніякае ліхо з імі не справіцца, бо згодная грамада, бы адзін вялікі чалавек, вялікі багатыр, дужэйшы за ўсіх багатыроў» [7. С. 89]. Фальклорна-педагагічная скарбонка нашага народа ўтрымлівае шэраг выслоўяў, якія падкрэсліваюць перавагу грамадскага спосабу жыцця: «Моцны статак чарадою, а людзі грамадою» [8. С. 374], «У гурце нішто не страшна» [8. С. 375], «Адзін дуб у полі — то не лес» [9. С. 83], «Калі робіш укупе, не баліць у пупе» [8. С. 374] і інш.

У адрозненне ад многіх артадаксальных мысліцеляў, якія супольнасць, цэлае ставілі недасягальна вышэй індывідуума, адзінкі, пры практычным адкідванні інтарэсаў апошніх, у народзе паступова фарміравалася ідэя аб неабходнасці сінтэзу інтарэсаў грамадства і асобы. У многіх выпадках канкрэтная чалавечая асоба не растварaецца ў скіраванасці да агульнага дабра: «Няхай кожан сам сябе глядзіць» [9. С. 109]. «Яшчэ той не радзіўся, каб усяму свету дагадзіў» [8. С. 377], — папярэджвала народная мудрасць. «Як пасцелеш сабе, так і выспішся» [10. С. 145], — такую прымаўку сярэднявечча запісаў у той час першы айчынны парэміёлаг С. Рысінскі.

У выніку гістарычных абставін з цягам часу такая арыентаванасць маральнага ідэалу на землях Бацькаўшчыны паступова аслаблялася. Шырокія сувязі з краінамі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы садзейнічалі пранікненню ў грамадскую свядомасць рэнесансавых індывідуалістычных ідэй. Аграрная рэформа XVI ст. у многіх месцах увяла падворнае землекарыстанне замест абшчыннага, што істотна разбурала абшчынны лад вясковага жыцця і ўстанаўлівала прыватна-ўласніцкія, індывідуалістычныя тэндэнцыі. Для параўнання, у Расіі падобныя працэсы набралі пэўны дынамізм толькі ў пачатку XX ст. у сувязі са сталыпінскай рэформай. Падобнай «дэфармацыі» маральнага ідэалу беларусаў спрыялі таксама такія якасці нацыянальнай псіхалогіі, як засяроджанасць нашых прашчураў на ўласным унутраным свеце, схільнасць да адзіноты і інш. Тым не менш народная думка дапускала розныя варыянты самавыяўлення індывідуальнасці, забеспячэння ўласнага шчасця, але абавязкова ў рэчышчы імкнення да агульнага дабра. Сацыяльная аснова маральнага ідэалу ў этнічнай педагогіцы беларусаў не прыніжалася.



### Літаратура


1. **Салееў В. А.** Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы. Мн., 1994.
2. **Чэчат В. У.** Педагогіка сямейнага выхавання. Мн., 1995.
3. **Вяткин Б. А., Хотинец В. Ю.** Этическое самосознание как фактор развития индивидуальности // Психологический журнал. 1996. № 5.
4. **Розанов В. В.** Сумерки просвещения. М., 1990.
5. **Каптеров П. Ф.** Избранные педагогические сочинения. М., 1982.
6. **Пiлiпенка М. Ф.** Паходжанне беларускага народа. Мн., 1995.
7. **Сержпутовский А. К.** Сказки и рассказы белорусов-полешуков. СПб., 1911.
8. **Прыказкі і прымаўкі:** У 2 кн. Кн. 1. Мн., 1976.
9. **Прыказкі і прымаўкі:** У 2 кн. Кн. 2. Мн., 1976.
10. **Порецкий Я. И.** Соломон Рысинский. Мн., 1983.


**(Заканчэнне будзе)**

# Народная Асвета

7/1999

# МАРАЛЬНЫ ІДЭАЛ ЭТНІЧНАЙ ПЕДАГОГІКІ БЕЛАРУСАЎ

*В. С. БОЛБАС,*
*прарэктар па навучальнай рабоце*
*Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута,*
*кандыдат педагагічных навук*

**(Заканчэнне. Пачатак у № 6)**

Многія даследчыкі сыходзяцца на думцы, што вызначальнымі рысамі і якасцямі маральнага ідэалу беларусаў з'яўляюцца гуманнасць, дабрыня, памяркоўнасць, мяккасардэчнасць. Хрысціянская ідэалогія любві да бліжняга замацоўвала адпаведную скіраванасць маральнага ідэалу і акцэнтавала ўвагу на фарміраванні такіх маральных якасцей, як добразычлівасць, шчырасць, міласэрнасць, спагадлівасць («Еш хлеб і людзям дай» [1. С. 89]), схільнасць да спачування, суперажывання («Бо й ворага ў бядзе шкода» [1. С. 42]), памяркоўнасць, цярплівасць («Хто цярплівы, той шчаслівы» [2. С. 299]), сціпласць, стрыманасць («Не той моцны, хто стрымлівае коней, а хто стрымлівае сябе» [3. С. 111]). Народныя ўяўленні ў спалучэнні з ідэаламі хрысціянскай этыкі абумовілі акцэнтаванне ўвагі на такіх якасцях, як праўдзівасць, незласлівасць, ветлівасць, паслухмянасць і інш.

Народна-педагагічная скарбонка ўтрымлівае шырокі спектр маральных рыс і якасцей, якія павінны быць уласцівы кожнай прыстойнай асобе. Ключавыя ж пазіцыі там займаюць справядлівасць і чалавекалюбства. Узровень духоўнай дасканаласці асобы правяраецца выкананнем залатога правіла маралі, якое з вуснаў беларускага народа гучыць так: «Усе, што сабе не міла, другому не зыч» [2. С. 457]. Этнапедагогіка беларусаў мела на мэце выхаванне такога чалавека, для якога б кантралёрам і рэгулятарам паводзін з'яўлялася маральная свядомасць.

Народная мудрасць звяртала асаблівую ўвагу на тое, што крытэрыем маральнасці асобы з'яўляецца не проста наяўнасць у яе сукупнасці фундаментальных маральных якасцей, а абавязковае іх праяўленне ў актыўнай дзейнасці. Чалавек з высокім узроўнем маральнасці павінен сваім асабістым прыкладам садзейнічаць усталяванню дабра, удасканаленню людзей і свету. Дабрачыннасць у народных уяўленнях утварае самую сутнасць маральнага ідэалу і разглядаецца не толькі і не столькі як сукупнасць адпаведных рыс і якасцей, а ў першую чаргу як канкрэтнае дзеянне. Праяўляецца яна непасрэдна ў людскіх зносінах. Добрыя справы павінны вызначаць маральную годнасць чалавека. Прычым менавіта стваральная дзейнасць на карысць грамадства ў беларусаў заўсёды выступала на першы план.

Вось чаму народнае выхаванне высока цэніць, але не абсалютызуе веды і не заўсёды прытрымліваецца палажэнняў аб тым, што маральная асвета павінна папярэднічаць арганізацыі адпаведных паводзін. Вельмі часта маральныя нормы ўспрымаюцца выхаванцамі праз канкрэтную дзейнасць, што апрача ўсяго іншага дапамагае прадухіліць разрыў паміж свядомасцю і паводзінамі.

Такія падыходы ў фарміраванні маральнага ідэалу прывялі да развіцця і ўсталявання ў нашага народа талерантнасці — адной з галоўных рыс, якая робіць яго адметным нават сярод бліжэйшых суседзяў. Са старажытных часоў, з негвалтоўнага ўвядзення хрысціянства, калі адначасова спавядаліся праваслаўе і язычніцтва, у беларусаў фарміруецца цярпімасць да розных веравызнанняў, павага да людзей з іншым светаўспрыманнем і складам мыслення. Адносіны да прадстаўнікоў розных нацый і нават сацыяльна-саслоўных катэгорый насельніцтва ў асноўным насілі роўны, спакойны, дружалюбны характар. Такім чынам, як адзначае Э. С. Дубянецкі, стрыжнем маральнага ідэалу паступова становіцца нацыянальна-рэлігійная і духоўна-інтэлектуальная талерантнасць [4. С. 33].

Не выпадкова ў перыяд XIV—XVII стст. на беларускіх землях трывала ўсталёўваецца шматканфесіянальны і поліэтнічны склад насельніцтва. Вялікае княства Літоўскае было прытулкам для многіх ерэтыкоў і адступнікаў, якія перасяляліся сюды з-за рэлігійнага ці нацыяналістычнага ўціску ў сябе на радзіме. Аналіз беларускай вуснай народнай творчасці дае ўсе падставы сцвярджаць, што ў ёй практычна адсутнічаюць праявы адмоўных, непрыхільных адносін нашых продкаў да іншародцаў і іншаверцаў. Развіццё падобных якасцей замацоўвалася асноватворнымі палажэннямі хрысціянскай этыкі. Адзін з пастулатаў Евангелля прама заключаў: «И если вы приветствуете только братьев ваших, что особенного делаете? Не так ли поступают и язычники?» (Матф., 5, 47).

Працы многіх народазнаўцаў пацвярджаюць слушнасць падобных высноў. Л. Бараг спасылаецца на адпаведныя этналагічныя даследаванні М. Ф. Сумцова, які сцвярджаў, што для беларускага фальклору характэрны «мяккія, гуманныя легенды, у якіх сацыяльна-эканамічныя пытанні вырашаюцца ў духу хрысціянскай любві і пакорлівасці» [5. С. 33]. Небеспадстаўна многія даследчыкі ў якасці адной з рыс маральнага ідэалу беларусаў называюць набожнасць. Дастаткова згадаць такія прымаўкі і прыказкі, як «Без Бога — не да парога», «Бог усё бачыць» і інш. Шырокі ўжытак у нашага народа мелі духоўныя вершы, да Бога звярталіся штодзённа і ў радасці, і ў горы: «Дзякуй Богу», «Дапамажы, Божа».

Але, як справядліва прыкмячае Э. С. Дубянецкі, адносіны беларусаў да рэлігіі ніколі не насілі характару сляпой, усёпаглынальнай

веры. Рэлігійны фанатызм не ўласцівы тыповым прадстаўнікам нашага народа. Таму народная мудрасць перасцерагае: «На Бога спадзявайся, але і сам старайся», «Нікому з неба само не спадзе». Беларусы часта не давяраюць асобным святарам, а то і афіцыйнай царкве ўвогуле. Нездарма іх веру адзначаюць хутчэй як унутраную, душэўную, інтравертную, а не паказную, знешнюю, экстравертную [4. С. 35].

Змястоўнае напаўненне маральнага ідэалу этнічнай педагогікі беларусаў таксама ўтрымлівае шэраг якасцей, якія характарызуюць адносіны асобы да Радзімы, яе народа. Патрыятычныя памкненні прысутнічаюць у поглядах любога народа. Ва ўсходніх жа славян яны набываюць незвычайную ўстойлівасць і глыбіню.

Мноства казак, песень, калыханак, прыказак і прымавак апяваюць прыгажосць і непаўторнасць роднага краю, падкрэсліваюць мудрасць і веліч людзей, услаўляюць народных герояў. Любоў да бацькаўшчыны ў сапраўднага беларуса ніколі не выліваецца ў нянавісць да чужога, патрыятызм не пераходзіць у пыхлівы і агрэсіўны нацыяналізм. Адметнай асаблівасцю якасцей патрыятычнага напрамку, якія характэрны для маральнага ідэалу беларусаў, з'яўляецца іх напаўненне дабрынёй, гуманізмам, лірызмам. Патрыятычныя пачуцці прадстаўнікоў нашага народа часцей за ўсё ўяўляюць любоў да «мілага куточка», добразычлівасць да яго насельнікаў, пяшчотныя адносіны да жывой і нежывой прыроды. У іх існуе цвёрдае перакананне, што «Бацькаўшчыны не купляюць і не прадаюць», што «лепш у сваіх людзях з голаду ўмерці, чым у чужых людзях золата збіраць».

Звычайна на адзначаных вышэй і ім падобных якасцях як вызначальных рысах маральнага ідэалу нашага народа і засяроджваюць увагу даследчыкі. Але ж нашы продкі заўсёды праяўлялі сур'ёзную ўвагу і да выхавання мужнасці, адвагі, пачуцця ўласнай годнасці. У народзе былі ўпэўнены, што «адвагаю і пекла перайдзеш» [5. С. 55], бо «смеламу Бог памагае» [6. С. 294]. Яшчэ ў XVII ст. была запісана прымаўка: «На схіленае дрэва і козы залазяць» [7. С. 144].

Сённяшнім арганізатарам маральна-выхаваўчага працэсу варта звярнуць самую сур'ёзную ўвагу і на тое, якое вялікае месца адводзілі нашы прашчуры выхаванню такіх якасцей, як павага да старэйшых, шанаванне сваіх бацькоў. Сёння гэта праблема абвастрылася, мабыць, як ніякая іншая. Хацелася б у якасці ілюстрацыі прывесці такі прыклад. Калі мы чытаем народныя казкі ў сённяшняй іх апрацоўцы, то бачым, што даволі часта там падаецца добры малойца, які сабраўся ў свет для таго, «каб людзей паглядзець і сябе паказаць». У запісах жа XIX ст. чытаем такія словы беларускага асілка, адрасаваныя бацькам: «Я цяпер пайду пагляджу свету і скора *вярнуся памагаць вам на старасць*» [1. С. 12] (выдзелена мною. — **В. Б.**).

Трывалым падмуркам цэласнай сістэмы народнага выхавання ў беларускага народа заўсёды была праца. Уся каляндарна-абрадавая паэзія нашых продкаў пабудавана на прыроднай аснове. Багацце гэтай паэзіі, пышнасць рытуалаў і свят каляндарнага года падкрэсліваюць, што праца і адносіны да яе займалі адно з важнейшых месц у жыцці беларускага народа. Вось чаму прывіццё любві да працы, выхаванне працай і ў працы вызначалі мэты, змест, метады і сродкі народнай педагогікі. Тое, што без працы нельга не толькі дасягнуць пэўных вяршынь, але і наогул немагчыма стаць чалавекам, уяўляла адну з самых бясспрэчных ісцін, і гэта была адна з самых жыватворных ідэй, якая сілкавала этыка-педагагічныя погляды беларускага народа. Г. П. Арлова ў іерархіі маральных каштоўнасцей беларусаў працалюбства ставіць на першае месца. «Главным мерилом нравственности в народной педагогике является отношение человека к труду, его трудолюбие, умельство» [8. С. 14—15]. Наданне працалюбству высокай грамадскай значнасці і сацыяльнай завостранасці ўвогуле напаўняла народна-педагагічныя ідэі аб працоўным выхаванні высокім этычным сэнсам.

У народных уяўленнях маральна дасканалы чалавек павінен быць шчырым і гасцінным. Прыказка «Госць у хаце — Бог у хаце» як нельга лепш перадае важнасць такіх якасцей. У адной з народных песень фальклорнага зборніка XIX ст. ставіцца пытанне, чым жа ў першую чаргу можа ўславіцца чалавек: «ци своим гумном, ци своей жаной, ци своими детьми?». А адказ на гэта пытанне сфармуляваны наступным чынам: «Ой тым жа ён уславився», што «к себе гостей сподяваетца» [9. С. 3]. Такім чынам, гасціннасць, ветлівасць, добразычлівасць вылучаюцца ў лік найважнейшых маральных якасцей.

Народна-педагагічная думка выразна дыферэнцыравала ідэальна-маральныя якасці па полаўзроставаму прынцыпу. Так, у мужчын высока цаніліся маральныя каштоўнасці, якія грунтаваліся на волі, фізічнай сіле, спрытнасці, умельстве. Таму ў адпаведнасці з палавымі ролямі на першы план вылучаліся такія якасці, як цвёрдасць характару, адпаведнасць слоў і спраў, прыстойнасць, сумленнасць, пачуццё ўласнага гонару і інш. У жанчын на першы план вылучаліся дабрыня, сціпласць, стрыманасць, цнатлівасць, паслухмянасць і інш. Вусная народная творчасць сведчыць, што жанчына часцей за ўсё шукае свайго шчасця на шляхах суцяшэння, захавання сямейнай цеплыні, духоўнага самаўдасканалення. А. У. Марозаў адзначае, што «жанчына не можа апусціцца да ганебных дзеянняў, наадварот, яна заклікае ў свет лепшых пачуццяў дабра, згоды, узаемаразумення» [10. С. 82]. Наогул, для народнай традыцыі беларусаў характэрна адметная роля жанчын у сямейным і грамадскім жыцці. З даўніх часоў, нягледзячы на больш высокае сацыяльнае становішча мужчын, беларуская жанчына не знаходзілася ў дэспатычна-прыгнечаных сямейных умовах, як гэта было ў многіх іншых народаў.

Многія навукоўцы сцвярджаюць, што беларуская жанчына прымала актыўны ўдзел не толькі ў гаспадарчых справах сям'і, у арганізацыі быту. Яна часам адыгрывала дамінуючую ролю ў выхаванні дзяцей. Пачынаючы з калыханак, маці фарміравала ў дзяцей існаваўшыя тады стэрэатыпы светаўспрымання і грамадскага ўладкавання. Праз маці закладваліся асновы культуры і самасвядомасці.

Адпаведным маральным зместам народны выхаваўчы ідэал паступова напаўняецца ў залежнасці ад узросту выхаванцаў. Па сутнасці, народнай педагогікай былі выпрацаваны адпаведныя маральныя патрабаванні для кожнага ўзросту. Тое, што не дазвалялася ў адным перыядзе жыцця, станавілася нормай паводзін у іншым. На працягу жыцця ўскладняліся адносіны індывіда і грамадства, усталёўваліся самастойнасць паводзін і адказнасць за іх. Праўдзівасць паступова пераходзіла ў сумленнасць, незлаславасць у дабрыню, стрыманасць у памяркоўнасць і інш.

У народзе маральнасць асобы і яе ўчынкаў вымяралі ў адпаведнасці з патрабаваннямі хрысціянскай этыкі. Наогул, рэлігія і мараль уяўляюць два найбольш старажытныя пласты духоўнай культуры чалавека. Сама хрысціянская вера ў перамогу Дабра і Справядлівасці стварае магутны духоўны патэнцыял, без якога немагчыма маральнае напаўненне рэчаіснасці. А гэта як нельга лепш дапасуецца да агульначалавечых, народных уяўленняў аб сэнсе жыцця. Вось чаму К. Гельвецый пісаў, што рэлігійная маральнасць «ёсць не што іншае, як удасканаленая чалавечая маральнасць» [11. С. 145]. Нездарма з даўніх часоў беларусы вызначалі выкананне хрысціянскіх запаветаў адносінамі асобы да іншых людзей. «Хто людзей не саромеецца, той Бога не баіцца» [7. С. 148], — сцвярджалася ў адной з прымавак, запісаных у XVII ст.

Вельмі часта ў вуснай народнай творчасці беларусаў маральны ідэал увасабляўся ў вобразе казачнага героя — асілка, які спалучаў у сабе сукупнасць найвышэйшых маральных, фізічных і разумовых якасцей. Характэрна, што асілак маляваўся як звычайны чалавек, але булава ў яго некалькі дзесяткаў пудоў, за адзін раз ён з'ядаў цэлага быка, выпіваў бочку піва, адзіным учынкам ён мог ашчасліваць цэлы народ і г. д. Гэтым нібы падкрэслівалася, што па сутнасці асілак — звычайны чалавек, але валодае незвычайнай фізічнай і духоўнай сілай. Тым самым усталёўвалася думка аб магчымасці духоўнага і фізічнага ўдасканалення кожнага чалавека.

У вуснай народнай творчасці даволі часта ідэалізаванымі маральнымі якасцямі надзяляліся звяры, птушкі і нават нежывая прырода (дрэвы, сонца, вецер і г. д.). Асобныя з іх станавіліся ўзорам дасканаласці ў фарміраванні пэўных якасцей ці, наадварот, іншыя ўяўлялі прыклад сінтэзу адмоўных якасцей. Да першых, напрыклад, можна аднесці шчырых і руплівых працаўнікоў мурашку і вожыка, самаадданага сябра сабаку, даверлівага мядзведзя, да другіх — хітрую лісіцу, прагнага воўка і г. д.

Такім чынам, у этнічнай педагогіцы беларусаў выпрацавана даволі выразнае ўяўленне аб маральнай дасканаласці асобы. Глыбокае ж і грунтоўнае вывучэнне рыс і якасцей, якія характэрны для маральнага ідэалу беларускага народа, дапаможа сучасным распрацоўшчыкам тэорыі маральнага выхавання і практычным арганізатарам гэтага працэсу ўдакладніць маральна-выхаваўчыя мэты на сучасным этапе развіцця грамадства і адпаведна ўзбагаціць метады і сродкі выхавання, што дазволіць павысіць яго выніковасць.



**Літаратура**


1. **Сержпутовский А. К.** Сказки и рассказы белорусов-полешуков. СПб., 1911.
2. **Прыказкі і прымаўкі:** У 2 кн. Кн. 2. Мн., 1976.
3. **Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы** / Скл. Ф. Янкоўскі. 3-е выд. Мн., 1992.
4. **Дубянецкі Э. С.** Беларускі нацыянальны характар: спроба даследавання // Адукацыя і выхаванне. 1995. № 5.
5. **Бараг Л.** Беларуская казка. Мн., 1969.
6. **Добровольский В. Д.** Смоленский этнографический сборник. СПб., 1893.
7. **Порецкий Я. И.** Соломон Рысинский. Мн., 1983.
8. **Орлова А. П.** Народная педагогика как фактор развития теории нравственного воспитания. Витебск, 1996.
9. **Бессонов П.** Белорусские песни. М., 1871.
10. **Марозаў А. У.** Сацыяльна-псіхалагічныя аспекты адлюстравання рэчаіснасці ў сямейна-бытавых песнях беларусаў // Весці АН Беларусі. Серыя грамадскіх навук. 1992. № 2.
11. **Гельвеций К. А.** Об уме // Соч.: В 2 т. М., Т. 1. 1973.


# АСАБЛІВАСЦІ ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫХ ЗНОСІН У СІСТЭМЕ «ВЫКЛАДЧЫК — СТУДЭНТ»


***І. У. ЖУРЛОВА,***
***асістэнт кафедры педагогікі***
***Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута***


Гаворачы аб эфектыўнасці прафесіянальнай падрыхтоўкі студэнтаў педагагічнай ВНУ, мы павінны прымаць пад увагу не толькі высокі ўзровень ведаў выкладчыкаў у галіне іх спецыялізацыі, педагогікі і псіхалогіі, але і культуру зносін са студэнтамі, што вызначаецца асобасна-этычнымі якасцямі. Гэта тым больш важна, што стыль работы і зносін выкладчыкаў, якія рыхтуюць настаўнікаў, адбіваецца на педагагічнай дзейнасці іх выхаванцаў, таму што ў ходзе практыкі, як правіла, студэнты імітуюць і адаптуюць стыль педагагічных зносін іх выкладчыкаў.

Асноўная функцыя прафесіянальных зносін выкладчыка са студэнтамі — фарміраванне педагагічна мэтазгодных міжсуб'ектных зносін, якія садзейнічаюць актывізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу. Зыходзячы з вышэйсказанага, культура зносін выкладчыкаў са студэнтамі мае на ўвазе, з аднаго боку, інфармацыйна-прадметнае ўзаемадзеянне, а з другога — стварэнне ў сістэме «выкладчык — студэнт»